## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ

***Юрый Міхайлавіч БАБІЧ, кіраўнік Цэнтра славянскіх моў і культур, старшыня Віцебскай абласной арганізацыі ТБМ імя Ф. Скарыны, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства:***



– На пачатку верасня мінулага года пачаў сваю працу Цэнтр славянскіх моў і культур. Гэта сумесны праект філалагічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава і Інстытута неафілалогіі Зеленагурскага ўніверсітэта (Польшча).

Сёння мы пералічым асноўныя справы цэнтра ў 2017 / 2018 навучальным годзе.

**1.** Мы арганізавалі шэраг творчых сустрэч з беларускімі пісьменнікамі, у прыватнасці з Міхасём Мірановічам, Альгердам Бахарэвічам, Юліяй Цімафеевай, Вальжынай Морт.

**2.** На працягу навучальнага года ў межах цэнтра працавала перакладчыцкая майстэрня (адказная – Вольга Фёдараўна Сянькова), дзе студэнты, пераважна спецыяльнасці «рамана-германская філалогія», практыкаваліся ў перакладзе з адной славянскай мовы на іншую. Лагічным вынікам працы згаданай майстэрні стаў конкурс перакладчыкаў, праведзены падчас Дня польскай мовы ў межах Тыдня пазнання і творчасці, дзе хлопцы і дзяўчаты перакладалі прапанаваныя тэксты, у тым ліку і паэтычныя, з польскай мовы і на польскую.

**3.** У кінаклубе цэнтра (адказныя – Вольга Фёдараўна Сянькова і Любоў Якаўлеўна Глазман) адбываліся прагляды папулярных мастацкіх фільмаў на польскай мове з далейшым іх абмеркаваннем. Нязмушаная, прыязная атмасфера, у якой праходзілі прагляды, спрыяла ўдасканальванню камунікацыі папольску, прывабляла студэнтаў і з іншых факультэтаў. Адначасова наладжваліся дыскусіі на актуальныя літаратурныя тэмы.

**4.** На працягу навучальнага года пры цэнтры працавалі курсы польскай мовы, арганізаваныя Інстытутам польскім у Мінску. У лістападзе 2017 года была заключана Дамова пра супрацоўніцтва паміж Інстытутам польскім у Мінску і ВДУ імя П.М. Машэрава, у падрыхтоўцы якой прымала ўдзел і кіраўніцтва цэнтра. Для абмеркавання магчымых шляхоў міжнароднага супрацоўніцтва ў лістападзе 2017 года кіраўнік цэнтра сустрэўся з дэканам факультэта польскай і класічнай філалогіі Познанскага ўніверсітэта імя Адама Міцкевіча прафесарам Рафалам Дымчыкам. З польскага боку была выказана зацікаўленасць ва ўстанаўленні больш цесных навуковых і адукацыйных кантактаў.

**5.** Цэнтр падтрымлівае трывалыя сувязі з Беларускім інстытутам навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку (БІНіМ), пастаянна адбываецца абмен інфармацыяй. З боку нашых амерыканскіх калег выяўляецца істотная цікавасць да праектаў, накіраваных на даследаванне беларуска-польскіх літаратурных сувязяў.

**6.** Вельмі важнай падзеяй стаў Фестываль беларускага слова. У гэтым годзе свята набыло яшчэ большы размах, штодня праводзіліся розныя імпрэзы з удзелам не толькі студэнтаў нашага ўніверсітэта, але і вучняў віцебскіх школ і гімназій. Сябры цэнтра таксама актыўна ўдзельнічалі ў правядзенні свята беларускай культуры. Так, у прыватнасці, была арганізавана і з поспехам праведзена імпрэза пад назвай «З гітарай па-беларуску».

**7.** У снежні 2017 года студэнты філалагічнага факультэта, у тым ліку і сябры рады цэнтра, праходзілі вучэбна-краіназнаўчую практыку ў Інстытуце неафілалогіі Зеленагурскага ўніверсітэта. Падчас практыкі нашыя хлопцы і дзяўчаты пазнаёміліся з польскімі равеснікамі з дзейнасцю цэнтра, абмеркавалі магчымыя сумесныя праекты, якія плануецца рэалізаваць у час наведвання студэнтамі Зеленагурскага ўніверсітэта нашай ВНУ. Кіраўнік цэнтра на працягу тыдня праходзіў стажыроўку ў Інстытуце неафілалогіі па праблемах выкладання польскай мовы як замежнай.

**8.** У межах Тыдня пазнання і творчасці ўпершыню быў праведзены Дзень польскай мовы і культуры. Студэнты філалагічнага факультэта і вучні віцебскіх школ і гімназій, якія вывучаюць польскую мову, прынялі ўдзел у конкурсе чытальнікаў польскай паэзіі, турніры перакладчыкаў, у напісанні дыктоўкі на польскай мове і алімпіядзе па польскай мове. Вершы папольску чыталі ў тым ліку і студэнты з Туркменістана.

А яшчэ хацелася б адзначыць выразна акрэсленую тэндэнцыю на плённае супрацоўніцтва філалагічнага факультэта і Віцебскай абласной арганізацыі ТБМ. Дэкан філфака прафесар Сяргей Нікалаенка падтрымлівае ініцыятывы Таварыства беларускай мовы, накіраваныя на патрыятычнае выхаванне моладзі, на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці маладога пакалення. Таксама па яго ініцыятыве зроблены вельмі важныя крокі ў плане ўсебаковага даследавання творчасці нашага славутага земляка, народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, ушанавання памяці вялікага творцы.